УДК 821.161.3.09-31:929:7.07"19"

**Налётава Наталля Мікалаеўна**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
(г. Віцебск, Беларусь)
nalyotova.nathalie@mail.ru

# ДЗЕЯЧ КУЛЬТУРЫ ЯК АБ'ЕКТ МАСТАЦКАГА АДЛЮСТРАВАННЯ Ў РАМАНЕ-ЭСЭ «ЯК АГОНЬ, ЯК ВАДА…» АЛЕГА ЛОЙКІ

У артыкуле аналізуецца мастацкае адлюстраванне асобы і творчасці І.Д. Луцэвіча ў рамане-эсэ «Як агонь, як вада…» Алега Лойкі. Сцвярджаецца, што зварот пісьменніка да ўзнаўлення вядомага беларускага дзеяча меў на мэце падкрэсліць яго вызначальную ролю ў развіцці нацыянальнай культуры.

***Ключавыя словы:*** мастацкая інтэрпрэтацыя, нацыянальная гісторыя і культура, дзеяч культуры, беларуская проза, раман-эсэ

The article analyzes the artistic reflection of the personality and creativity of I.D. Lutsevich in the novel-essay "Like fire, like water..." A. Loiko. It is argued that the writer's appeal to the reproduction of the famous Belarusian figure was intended to emphasize his decisive role in the development of national culture.

***Keywords:*** artistic interpretation, national history and culture, cultural figure, the Belarusian prose, novel essay

Раман-эсэ «Як агонь, як вада…» Алега Лойкі – эстэтычны феномен, бо ў ім пісьменнік не абмяжоўваецца біяграфічнымі фактамі дзеяча культуры: паходжаннем («інтэлігент у мужычай скуры» [1, с. 18], «род Луцэвічаў быў шляхецкі: яго жыццёвыя ўявы, сацыяльная псіхалогія, традыцыі і звычаі як у блізкім мінулым, так і ў больным далёкім, натуральна ж, не былі па-за тым, што характарызавала сабой дробную шляхту» [1, с. 24]), адукацыяй і інш., а падае гісторыю сталення свайго героя, выяўляе шматграннасць яго асобы. У дадзеным творы аўтар выкарыстоўвае наступныя мастацкія прынцыпы індывідуалізацыі галоўнага вобраза: партрэтная і разгорнутая псіхалагічная характарыстыка (заўвагі тыпу «падлеткавыя, як зусім не дзяціныя, вусны. Як у дзяўчаці, тонкія, выгнутыя дужкі броваў» [1, с. 17]; «у камізэльцы, рукавы белай кашулі закасаны, высокі цвёрды каўнерык ад манішкі падбіраў падбародак, светлыя валасы» [1, с. 75]; «элегантны касцюмчык, хоць і не дарагі, але адпрасаваны, на плечыках дапасаваны, і чысты, белы каўнерык, элегантна перахоплены модным гальштукам, падпірае падбародак. Не дрымучая барада – інтэлігенцкія вусікі» [1, с. 126]; «бландзін» [1, с. 111]; «з задуменнымі вачыма» [1, с. 28]; «самотнік» [1, с. 21]; «не вельмі гаваркі» [1, с. 28]; «памаўклівы» [1, с. 192]; «нешматслоўны» [1, с. 279]; «адзінокі паэт» [1, с. 39]; «горкай у свеце сірацінай … лічыў сябе Купала» [1, с. 78]; «часта самотны, адзінокі» [1, с. 105]; «негаваркі ўвогуле, зацінаўся, уваходзіў у сябе» [1, с. 106]; «сум у вачах заставаўся глыбокі-глыбокі – нічым не развейны» [1, с. 417] і г. д.).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Акрамя таго, асаблівасці характару культурнага дзеяча, яго сацыяльныя, грамадска-палітычныя і літаратурна-крытычныя погляды выяўляюцца ў тэксце праз унутраныя маналогі і аўтарскія каментарыі, вытрымкі з лістоў: «Індывідуаліст!» [1, с. 37]; «Сапраўды, я не «чысты», патомны мужык – я мужык па прыналежнасці да стану арандатараў, па абставінах, па духу; і мяне кліча дух мой, пачуццё абавязку – яны клічуць мяне гаварыць ад імя мужыка. Я не іду на падман, бо іх, мужыкоў, крыўда – мая крыўда, маё гора – іх гора, мой лёс – наш лёс… Крыўда, прыгнёт спакон вякоў забівалі мужычую мару, стоптвалі ў яго душы папараць-кветку, і мару гэтую трэба ў мужыку сягоння будзіць» [1, с. 21–22]; «Ён завельмі нацярпеўся крыўды ад паноў-шляхты, каб у свае дваццаць тры гады лічыць за гонар, што мае ў метрыцы ўпісанае «шляхціц» [1, с. 25]; «адмежаваўся ад палітыкі, раз і назаўсёды. Дзе будзе палітыка, дзе будзе патыхаць ёю, ён даў сабе зарок: туды не ўмешвацца, не ўцягвацца, не ўваходзіць… Выбар быў зроблены» [1, с. 39]; «артыкул «Сплачывайце доўг!» глыбока раніў яго душу. Балюча было не ад таго, што Ластоўскі недаацаніў яго паэзію, а ад таго, што адмаўляў на той час самае галоўнае ў роднай літаратуры – яе сацыяльны пафас, яе службу канкрэтным, надзённым палітычным, нацыянальным задачам» [1, с. 161].

Погляды Купалы на сувязь мастацтва з палітыкай выразна выяўляюцца ў дыялогах з іншымі вядомымі і ўплывовымі асобамі тагачаснага перыяду, у прыватнасці, з Іванам Луцкевічам: «Прыгожае пісьменства – не палітыка. Мая беларушчына – не палітыка!» [1, с. 181]; «…з чыстым сумленнем цяжка рабіць палітыку, і таму я ад яе ўцякаю» [1, с. 182]. А таксама ў аўтарскіх каментарыях: «Сітуацыя зразумелая, творчая задача ясная, творчыя думкі і пачуцці павінны быць мацнейшыя за боль сэрца» [1, с. 411]. Гістарычная дакладнасць у рамане-эсэ выявілася, да прыкладу, у апісанні крытычнага стаўлення І.Д. Луцэвіча да дзейнасці БелАППа і яе членаў, да ідэолагаў вульгарнага сацыялагізму: «Купала як бы замёр у глыбокім одуме. Як гэта сапраўды здарылася, што літаратурная барацьба перарасла ў наклейванне палітычных ярлыкоў, у такое абвінавачванне, што хоць адразу стаў таварыша пад сценку і расстрэльвай?... Само па сабе творчае спаборніцтва літаратурных арганізацый даць такога ніяк не магло! Сутычка самалюбстваў? Прага лідарства? Права тых, хто быў нікім, стаць усім?.. Самалюбства – пагібель мастаку» [1, с. 323]; «Якія катэгарычныя, блізарука самаўпэўненыя ў праваце толькі сваёй арганізацыі, толькі свайго часопіса, толькі сваіх выкладак!» [1, с. 324]; «О, тут Купала ўжо адчуў халоднае лязо сякеры, прыстаўленае да ягонага горла, убачыў, што з Бэндэ – не жарты» [1, с. 330]; «…Бэндэ – гэты функцыянер вульгарнага сацыялагізму, які ва ўмовах зараджэння культу асобы стаў у Беларусі найгвалтоўнейшым парушальнікам законаў – свавольны, ганарысты, упэўнены ў сабе, проста хмельны ад свае ўлады» [1, с. 333]; «І былі яшчэ грубасць і жорсткасць, якіх крытыку (Бэндэ. – *Н. Н.*) было не пазычаць, упартасць да фанатызму, задаволенасць ад займетай улады, ад таго, што яго баяцца» [1, с. 347]. А. Лойка



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з псіхалагічнай тонкасцю апісвае душэйны стан творцы ў невыносна цяжкіх грамадска-палітычных умовах 1930-х г., калі даведзены да адчаю ідэолагамі вульгарнага сацыялагізму Купала зрабіў спробу самагубства. Прычым А. Лойка не асуджае творцу, ацэньваючы гэтую сітуацыю як спробу класіка абараніць «свой велічны шлях» [1, с. 355], а 22 лістапада 1930 года – як «дзень Купалавай Непакоры, Вялікасці, Вялікай Маральнай Перамогі» [1, с. 360].

А. Лойка засяроджвае ўвагу на такіх рысах і ўласцівасцях характару І.Д. Луцэвіча, як *інтэлігентнасць* («інтэлігент у мужычай скуры» [1, с. 18]; «чаму ён так падобны – абліччам, паставай, жэстамі – якраз да шляхцюка?» [1, с. 25]), *рамантычнасць* («прасветлены душою, улюбёны ў свет, поўны высакародных пачуццяў» [1, с. 24]; «Купала-рамантык» [1, с. 107]), *шчодрасць* («як і бацька, не сквапіўся на рубель» [1, с. 14]), *разважлівасць, мэтанакіраванасць* («Не, ён, Ясь, правільна выбраў шлях, ён з яго не саступіць!» [1, с. 27]; «Ён увесь як заведзеная спружына: адна напружанасць, гатоўнасць, моц, прага. Ён ведае, чаго ён хоча: пісаць, чытаць. Ведае, што пісаць, для каго пісаць» [1, с. 36]), *ганарлівасць* («Усім здаецца ён сціплым, сарамяжным, а ці ж у сваіх марах, памкненнях, жаданнях ён сціплы?» [1, с. 37]); «Гонарам ён не паступіцца! Лепш яму не падступацца да кагосьці, чым паступацца хоць на пазногаць перад кімсьці сваім гонарам… Лішне прасіць не будзе, кланяцца не будзе» [1, с. 38]; «нехаценне ісці на паклон» [1, с. 93]; «толькі ў высокай годнасці бачыў паэт тых, хто яго падтрымліваў» [1, с. 51], *гордасць* («гордая душа Купалы» [1, с. 78]; «нібы масла ў агонь, падлівала раздражнёнасць, якую ў Купалу выклікаў комплекс парыя – незагойная рана, свядомасць таго, што ён вось – недавучка» [1, с. 94]; «Гордасць Купалы пераходзіла ўжо ў хваравлівасць» [1, с. 94]; «Купала не скардзіўся. Купала быў горды» [1, с. 108]); *крыўдлівасць* («Ён не любіў скардзіцца, выказваць свае крыўды ўголас» [1, с. 159]), *ранімасць, самаўпэўненасць, працавітасць* («старанна працаваў Янка Купала ў газеце, калі нішто не выбівала яго з каляіны служэння беларушчыне» [1, с. 89]; «цягавіты» [1, с. 92]; «загружаны працай па шыю, свядомы ў сваёй працы, ставячы працу даражэй за ўсё на свеце» [1, с. 177]), *эрудзіраванасць* («прагны да звычайнай кнігі» [1, с. 62]), *самаадданасць* («абуяны прагай друку» [1, с. 40]), *прынцыповасць, удзячнасць, самотнасць, стрыманасць* і *ўраўнаважанасць* («Ён увогуле ніколі не ўзрываўся, не раздражняўся вонкі, нават не выяўляў свайго раздражнення, а толькі вочы яго смутнелі» [1, с. 106]; «ніколі не быў скандальны» [1, с. 107]), *прамалінейнасць, патрабавальнасць, празмерны індывідуалізм* («Не мог пераступіць сам у сабе «індывідуаліста», каб звязаць свой малады лёс з якім-небудзь падпарадкаваннем…» [1, с. 93]; «непакорны індывідуаліст» [1, с. 93]), *акуратнасць, тактоўнасць, ветлівасць, свабодалюбства* («Вольная птушка – у турме» [1, с. 97]), *карэктнасць* («Маладых ён любіў, вітаў, … хоць публічна атэстацыі іх талентам, кнігам, выступленням Купала, як правіла, не даваў» [1, с. 279]), *прынцыповасць* і *сумленнасць* («Для Купалы важней застаецца не толькі ідэя, але і спосабы яе дасягнення, сродкі дасягнення. Чысціня іх, цнатлівасць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рупіць Купалу, і не быў бы ён сабой, каб мерка цнатлівасці яму не рупіла, каб чыстым рыцарам ён не прагнуў быць» [1, с. 100]; «Купала аказаўся сярод адзінак, – адзін з першых сярод адзінак, прыплачваючы жыццём, але не адступаючыся ад сумлення, не здраджваючы сумленню, не прадаючы яго» [1, с. 362]), *шчырасць, адкрытасць, гасціннасць* («Але найбольш любілі ў гэтай хаце госця» [1, с. 295]) і інш. Як адзначае раманіст, І.Д. Луцэвіч цаніў у іншых такія рысы характару, як жыццялюбства, настойлівасць, шчырасць, бескарыслівасць, упартасць, самаахвярнасць, уменне адстойваць уласны пункт погляду.

Паводле А. Лойкі, Купала добра ўсведамляў сваю вызначальную ролю ў літаратурна-культурным і грамадска-палітычным жыцці першай паловы XX ст.: «Самы лепшы паэт Беларусі ўсіх часоў – самы багаты набытак газеты «Наша ніва». Купала гэта ўжо разумеў» [1, с. 104]. Пісьменнік прытрымліваецца гістарычнай дакладнасці пры апісанні псіхічнага стану чулага, сумленнага і з абвостраным пачуццём справядлівасці творцы ў неспрыяльнай атмасферы 1908–1909 гг, панаваўшай у «Нашай ніве» (адчужэнне супрацоўнікаў рэдакцыі адзін ад аднаго з-за амбіцый), бачачы ў гэтым вытокі душэўнага крызісу і «ясенінскага» стылю жыцця Купалы-багемшчыка: «Але там, у святліцы Купалу глыбока сапраўды ніколі не разумелі ці мо часам удавалі, што не разумеюць, свядома закрывалі вочы на розныя штучкі Купалы, як там маглі называць яго знікненне з рэдакцыі» [1, с. 106]; «Пахмелле – заўсёды горкае. Рваўся Купала ў Вільню, у «Нашу ніву», як на пір, а вось табе, як у вір гаркаты» [1, с. 106]. Падчас жа другога прыезду ў Вільню, у 1913–1914 гг, сталы Купала падаецца дзейсным, адказным і дысцыплінаваным сакратаром выдавецтва і рэдактарам «Нашай нівы», самаадданым, больш сур'ёзным і незалежным грамадскім дзеячам, які імкнецца «ўзяць справу беларускага адраджэння ў свае рукі» [1, с. 180].

У адносінах да Я. Купалы пісьменнік выкарыстоўвае намінацыі «будучая слава Беларусі» [1, с. 7], «кніжнік» [1, с. 470], «народны паэт» [1, с. 7], «сімвал беларускае зямлі» [1, с. 7], «самы высакародны беларускі паэт» [1, с. 24], «вялікі паэт» [1, с. 43], «адвакат правоў мовы і народа» [1, с. 49], «выключны, надзвычайны паэт» [1, с. 50], «выразнік сацыяльнай нядолі, гістарычных крыўд, прагі зямлі і волі, светлага будучага» [1, с. 50], «паэт-самародак» [1, с. 94], «талент» [1, с. 132], «палітык, які мысліць еўрапейскімі маштабамі» [1, с. 243], «дастойны ўнук Скарыны» [1, с. 142], «валадар беларускага слова» [1, с. 239], «лідар нацыі» [1, с. 246], «аўтарытэт» [1, с. 264], «душа, аўтарытэт беларусізацыі» [1, с. 265], «Нестар літаратуры» [1, с. 279], «беларускі Пушкін» [1, с. 268], «першы вялікі паэт Беларусі (разам з Якубам Коласам. – *Н. Н.*)» [1, с. 275], «прарок» [1, с. 292], «стваральнік яркага, незабыўнага» [1, с. 378], «барацьбіт» [1, с. 469], «голас прыгнечанага дарэвалюцыйнага сялянства» [1, с. 321], «магутная асоба» [1, с. 361], «пясняр культу» [1, с. 363], «ахвяра культу» [1, с. 372] і інш., якія рознабакова характарызуюць гэтага грамадскага і культурнага дзеяча.

Думаецца, лепш паглыбіцца ва ўнутраны свет Янкі Купалы, адчуць яго адасобленасць і самоту, пошукі гармоніі з супярэчлівым светам Алегу Лой-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ку дазволіў уласны лірычны талент. Як слушна заўважае В. К. Шынкарэнка, «у з'яве спасціжэння аднаго творцы іншым галоўным чынам выяўляе сябе не столькі выпадковае, колькі заканамернае» [2, с. 186]. А. Лойка-паэт тонка адчувае душэўныя пакуты суб'екта свайго навукова-мастацкага даследавання і заўважае: «менш усяго радасці, больш – пакутаў, не развейных, бо маўклівых, зацяжных. Цяжка быць аўтарам ненадрукаванай кнігі, якая нібы ёсць і якой – няма! Яшчэ цяжэй быць аўтарам вершаў, якія рвуцца з сэрца, каб быць пачутымі іншымі, а іх ніхто не чуе, да нічыйго сэрца яны не даходзяць» [1, с. 33]; «Але ён дасюль не ведаў яшчэ, што прага друкавацца можа быць такой да болю ў думках балючай» [1, с. 36]. Ці іншая заўвага: «Ясь пісаў вершы пра сябе, пра сваю маці і як бы камяні здымаў са сваёй душы, цяжар, які яе прыдушваў. Маці ж вершаў не слаў,... ды і заусёды памятаў, што не такіх вершаў яна ад яго чакала» [1, с. 34]. Варта адзначыць, што цытаванне лістоў творцы, спасылкі на першакрыніцы дзеля абгрунтавання ўласнай пісьменніцкай канцэпцыі купалаўскай асобы, выказванні і ўспаміны сведкаў жыцця героя твора не змяншаюць эмацыянальнасці аўтара, які выразна ўсведамляе веліч дзеяча культуры і яго важную ролю ў беларускай гісторыі.

У рамане-эсэ пісьменнік выяўляе суб'ектыўнае разуменне лёсу і місіі творцы: «Паэт, ён і павінен быць адзін. Адзін, а прамаўляць за ўсіх, адзін, а быць голасам многіх – мужыкоў, сялянак, дзецюкоў, дзяўчат. Калі паэт прамаўляе голасам агулу, ці ж ён ужо гэтым не з агулам і ўжо праз гэта, ці ж ён адзінокі?» [1, с. 37]; «Асноўнае ў выдатнай асобе – адчуванне свайго шляху, абранне яго і руху па ім, самасцвярджэнне сябе на ім са сцвярджэннем сваёй праўды, свайго ідэалу. Не зламацца на шляху, не збіцца з яго…» [1, с. 354]. А. Лойка засяроджвае ўвагу таксама на асаблівасцях творчай работы Я. Купалы: «Як заўсёды, ён доўга выношваў задумы ў сабе, каб раптам, як лавіна, абрушвацца, спадаць радкамі вершаў» [1, с. 237]; «Ён жа быў савой-начніцай. Пісаў звычайна ноч навылёт, а ранкам – вясёлы, бадзёры, бо напісаў жа! – клікаў паслухаць напісанае» [1, с. 407].

З тэксту рамана-эсэ вынікае, што І.Д. Луцэвіч быў актыўным грамадска-палітычным і культурным дзеячам, які падтрымліваў сувязь з вядомымі асобамі першай паловы XX ст.: М. Горкім, А. Паўловічам, братамі Гарэцкімі, С. Палуянам, В. Ластоўскім, А. Лявіцкім, Ц. Гартным, Б. Тарашкевічам, І. Замоціным, З. Бядулем, Я. Хлябцэвічам, А. Уласавым, братамі Луцкевічамі, У Самойлам, Б. Эпімах-Шыпілам, В. Брусавым, Л. Гірам, С. Шымкусам, К. Буйло, П. Мядзёлкай і інш.

Як праўдзіва паказана ў рамане-эсэ «Як агонь, як вада…», у складаныя для радзімы перыяды пісьменнік-патрыёт не мог заставацца па-за палітыкай, жорстка асуджаў гвалт Першай сусветнай вайны (цыкл «Песні вайны»), шчыра вітаў утварэнне БССР, а таксама балюча ўспрымаў падзел Беларусі, калі не было «роўнага права на Усход і Захад быць сабой, працаваць на сябе, спяваць песні на поўныя грудзі» [1, с. 434], таму агульнавядомыя падзеі 1939 года ён лічыў гістарычнай справядлівасцю. Наконт апошняга заўважым, што падобны



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пункт погляду іншага класіка беларускай літаратуры – Якуба Коласа – падаецца ў аповесці «Крыжавыя дарогі» С. Х. Александровіча.

Варта заўважыць, што на рэпрэзентацыю Алегам Лойкам Янкі Купалы моцны ўплыў аказала тагачасная савецкая ідэалогія. Да прыкладу, герой паказаны аднадумцам бальшавікоў, шчырым прыхільнікам рэвалюцыйных пераўтварэнняў і савецкай улады. У якасці пацверджання думкі прывядзём унутраны маналог Купалы пасля знаёмства з артыкулам «Галавакружэнне ад поспехаў» І. В. Сталіна: «Савецкая ўлада – мудрая, святая, толькі што людзі, як лес, няроўныя. Не ўсе яшчэ людзі аднолькава дараслі да вышыні савецкай улады, дадзенай усім як бы навырост. Вось і калектывізацыя – навырост: трэба дацягнуцца да яе розумам і сэрцам, парываючы са звычкамі старога вясковага ўкладу» [1, с. 334]. Лойка артыкулюе «мужыцкасць» Купалы.

Такім чынам, у рамане-эсэ «Як агонь, як вада…» класік беларускай літаратуры рэпрэзентуецца прыхільнікам рэвалюцыйных пераўтварэнняў, сацыялізму, інтэлектуалам, аўтарытэтным паэтам, драматургам і публіцыстам, дысцыплінаваным і адказным кіраўніком рэдакцыі, арыгінальным перакладчыкам, адной з цэнтральных фігур беларускага Адраджэння. Уплыў часу на трактоўку асобы Янкі Купалы выявіўся ў артыкуляванні А. Лойкам радыкальнай грамадзянскай пазіцыі і грамадскай актыўнасці пісьменніка.

## Літаратура

1. Лойка, А. А. Як агонь, як вада… : раман-эсэ пра Янку Купалу / А. А. Лойка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. – 478 с.

2. Шынкарэнка, В. К. Нястомных пошукаў дарога: праблемы паэтыкі сучаснай сучаснай беларускай гістарычнай прозы / В. К. Шынкарэнка. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 208 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова